*Подсекция «Белорусский и русский языки»*

**УДК 811. 16**

# ДЗЯРЖАЎНЫ СТАТУС БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ВКЛ

*Студэнт – Марханава В.В., 23 мо, 3 курс, ФТС*
*Навуковы*
*кіраўнік – Мантур А.Я., ст. выкладчык*
*УО «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца фарміраванне беларускай народнасці і старабеларускага пісьменства, акрэсліваецца дзяржаўны статус беларускай мовы ў ВКЛ.

**Ключавыя словы:** беларуская народнасць, дакументы дзяржаўнага значэння, кнігадрукаванне, старабеларуская мова, пісьменства, мастацкая літаратура.

Сучасная беларуская мова – адна з развітых і багатых моў свету, якая прайшла доўгі і складаны працэс свайго развіцця, непарыўна звязаны з гістарычным лёсам беларускага народа [2, с. 13].

У XIII ст. пасля распаду Кіеўскай Русі на шэраг самастойных княстваў пrасторавыя адрозненні паміж народамі яшчэ больш паглыбіліся, што побач з іншымі прычынамі садзейнічала фарміраванню самабытнай беларускай культуры. Беларуская народнасць утварылася з трох плямён: крывічы, радзімічы, дрыгавічы. Тэрмін Белая Русь упершыню сустракаецца ў канцы XIV ст. у адносінах толькі да Полацкай зямлі. У далейшым ён пашырыўся на ўсю Беларусь.

Асноўную ролю ў фарміраванні беларускай мовы, даследчыкі называюць яе “старабеларускай”, адыгралі мясцовыя гаворкі (паўночна-ўсходні і паўднёва-заходні дыялекты). Тагачасныя кніжнікі ў пісьменстве строга прытрымліваліся традыцыйных старажытнарускіх норм, а новыя моўныя рысы ў пісьмовых помніках адлюстроўваліся толькі зрэдку, у выглядзе паасобных “апісак”.

Як асобная самастойная мова старабеларускае пісьменства сфарміравалася ў перыяд, калі нашы землі знаходзіліся ў складзе Вялікага Княства Літоўскага. У той час яна мела назву “простая”, “руская” і фарміравалася на аснове пісьмовай спадчыны старажытнай усходнеславянскай мовы [1, с. 35].

У Вялікім Княстве Літоўскім старабеларуская мова выконвала функцыі дзяржаўнай мовы, ужывалася ва ўсіх сферах грамадскага жыцця і

была сродкам пісьмовых зносін на ўсёй тэрыторыі. На ёй упершыню ў гісторыі ўсходніх славян на пачатку XVI ст. з'явіліся друкаваныя кнігі ("Псалтыр" Ф. Скарыны – 1517 г., "Катэхізіс" С. Буднага – 1562 г., "Евангелле" В. Цяпінскага – 1580 г.); пісаліся мастацкія творы ("Александрыя", "Аповесць аб Трої" і іншыя перакладныя свецкія творы), арыгінальная мастацкая літаратура ("Ліст да Абуховіча", "Прамова Івана Мялешкі"), летапісы і хронікі ("Летапісец вялікіх князёў літоўскіх", "Баркалабаўская хроніка", "Хроніка Вялікага Княства Літоўскага і Жамойцкага"), вучэбныя кнігі ("Граматыка" Л. Зізанія, "Граматыка" М. Сматрыцкага), слоўнікі Л. Зізанія і П. Бярынды; ствараліся дакументы дзяржаўнага значэння. Гэта была мова законаў, судоў, канцылярый. Лепшыя моўныя здабыткі канцылярска-юрыдычнага пісьменства адлюстраваны ў Метрыцы Вялікага Княства Літоўскага ("Літоўская метрыка" – вялікі архіў дзяржаўных актаў, каля 600 кніг) і Статуце Вялікага Княства Літоўскага, які меў тры рэдакцыі – 1529, 1566, 1588 гг.

Пісьменства на Беларусі было на высокім узроўні і яшчэ больш інтэнсіўна пачало развівацца з узнікненнем кнігадрукавання [2, с. 14].

У гэты час жылі і працавалі такія вядомыя асветнікі, як Ф. Скарына, С. Будны, В. Цяпінскі, С. Полацкі, М. Сматрыцкі, А. Рымша. Усё гэта дае падставу вучоным называць XV – XVI стст. "залатым векам" у гісторыі беларускай культуры, мовы і літаратуры.

1. Зразікава, В.А. Беларуская мова. Эканамічная лексіка: вучэб. дапам. / В.А. Зразікава. – Мінск, 2012. – 216 с.

2. Завальнюк, У. Да Бога – на роднай мове / У. Завальнюк. – Мінск, 2019. – 274 с.

**УДК 94 (476)**

## ЕФРАСІННЯ ПОЛАЦКАЯ – СЛАВУТАЯ АСВЕТНІЦА

*Студэнт – Дарашэнка М.В., 19 рпт, 2 курс, ФТС*
*Навуковы*
*кіраўнік – Мантур А.Я., ст. выкладчык*
*УО «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт», г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя**. У артыкуле разглядаецца жыццёвы шлях і асветніцкая дзейнасць Е. Полацкай, прадстаўлена яе роля ў развіцці ўсходнеславянскай культуры.

**Ключавыя словы:** асветніца, вобраз, разнастайная дзейнасць, духоўнае самаўдасканаленне, рэалізацыя.